■ А вы ведалі?

РУБЕЛЬ ПАЙШОЎ АД ГРЫЎНІ,

або Што можна назваць старажытным «аналагам» долара?

Налета ў нашай краіне ўпершыню за часы дзяржаўнай незалежнасці ў абарот будуць уведзены манеты. Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў музейшчыкаў, якія металічныя грошы мелі хаджэнне калісьці на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Мне паказалі манетныя скарбы. Аказваецца, быў у нас час, калі (як і сёння) манеты не выкарыстоўваліся. Цікава было пачуць і пра распаўсюджанасць арабскіх манет. І пра тое, што раней падчас фінансавых крызісаў «уключалі друкарскі станок»...

З калекцыі Віцебскага краязначага музея.

5 капеек (сібірская манета). Расійская імперыя, 1778 г. | Сестэрцый. Рымская імперыя, 246-249 гг. | 1 дэсім 4-га года рэвалюцыі. Францыя, 1795-1796 гг. | 1 шылінг. Вольны горад Рыга, 1575 г.

— Гісторыю «манетнай тэмы» цікава вывучаць праз «прызму» скарбаў. У нашым музеі багатая калекцыя знойдзенага на тэрыторыі Віцебшчыны. Выстава ўсё больш папулярная сярод наведвальнікаў музея, напярэдадні хуткай перспектывы карыстацца манетамі людзям цікава, якія калісьці былі манеты, — распавядае **Валерый ШЫШАНАЎ, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея па навуковай рабоце**. — У IX-X стагоддзях, мяркуючы па скарбе, які школьнікі ў савецкі час знайшлі ў Лёзненскім раёне, у нас былі вельмі распаўсюджаны арабскія дырхамы. Манетныя двары знаходзіліся на тэрыторыі сучаснага Туніса, Ірака і Ірана, Узбекістана (у Ташкенце і Самаркандзе. — **Аўт.**). Гэта тлумачыцца проста: у краінах Арабскага халіфата тады здабывалася шмат срэбра і вялася актыўная чаканка манет. А ў Еўропе быў дэфіцыт каштоўных металаў. Таму і выкарыстоўваліся арабскія грошы. Адпаведныя скарбы былі знойдзены на берагах Заходняй Дзвіны, Дняпра — на гандлёвых шляхах. Дарэчы, чым пазней, тым проба манет была ніжэйшай, аж да медных даходзіла... Калі на Усходзе запасы срэбра вычарпаліся, быў так званы безманетны перыяд — прыкладна ў XI-XII стагоддзях. А на Русі тады грашыма былі кавалачкі скуры, а таксама сярэбраныя зліткі — грыўні. У XIII стагоддзі для наўгародскіх грыўняў стала ўжывацца найменне «рубель». Яно паступова «выцесніла» назву «грыўня». У XV стагоддзі зліткі «грыўня» і «рубель» перасталі быць грашова-аплатнымі сродкамі. Пры гэтым назва «рубель» засталася і перайшла на асноўную адзінку рускай манетнай сістэмы. Грыўні адрозніваліся па вонкавым выглядзе і вазе, і ў залежнасці ад рэгіёна, былі кіеўскія, наўгародскія, літоўскія (заходнярускія)... Апошнія — зліткі серабра ў выглядзе палачак з адной або некалькімі ўвагнутасцямі на спінцы. Памеры такіх грошай ад 10-17 сантыметраў, а вага — 100-105 грамаў. У летапісных крыніцах манета называецца грыўняй, або ізрой. Чаканка ўласных манет (залатыя (златнікі) і сярэбраныя (сярэбранікі)) у Кіеўскай Русі пачалася пры князі Уладзіміры. Але яны вельмі рэдкія і ў экспазіцыі не прадстаўлены.

«У IX-X стагоддзях у нас былі вельмі распаўсюджаны арабскія дырхамы. Манетныя двары знаходзіліся на тэрыторыі сучаснага Туніса, Ірака і Ірана, Узбекістана».

Асаблівасцю грашовага абароту Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з'яўлялася выкарыстанне чужых чаканных манет, што прымушала шукаць усё новыя рынкі для іх набыцця. Гэта было прыкладна ў 1300—1492 гадах. І ў грашовым абароце ВКЛ названа «перыядам пражскага гроша» — у гонар найбольш распаўсюджанай манеты... Калі ў Чэхіі былі знойдзены вялікія запасы срэбра, чэшскія каралі чаканілі досыць вялікую манету — грош. У экспазіцыі прадстаўлены скарб, які быў знойдзены ў 1968 годзе на балоце каля вёскі Зарэчча Віцебскага раёна. У музеі захоўваецца каля 80 манет — пражскія грошы праўлення Вацлава IV (1378—1419).

Па меры павелічэння здабычы срэбра і развіцця вытворчасці з'явілася магчымасць чаканіць буйныя сярэбраныя манеты. І яны сведчаць пра высокае развіццё тэхналогіі і медальернага мастацтва.

— У 1510-1512 гадах у вобласці Рудных гор на паўночным усходзе Багеміі адкрыты багатыя радовішчы серабра. Па загадзе мясцовага кіраўніка Стэфана Шліка ў 1516 годзе быў заснаваны пасёлак рудакопаў, які атрымаў назву Таль (ад нямецкага слова «tal» — даліна). У 1517 годзе населены пункт, які стаў даволі буйным, у гонар заступніка рудакопаў святога Яўхіма атрымаў назву Яўхімсталь. Адсюль пайшла назва буйной сярэбранай манеты талера. І манеты такога тыпу дамінавалі ў XVI—XIX стагоддзях і адыгрывалі важную ролю ў грашовым абароце Еўропы і ў міжнародным гандлі. Значнае распаўсюджанне, у тым ліку і на нашых землях, яны атрымалі ў XVI—XVIII стагоддзях. У віцебскай экспазіцыі прадстаўлены талер Усходняй Фрызіі, патагоны Іспанскіх Нідэрландаў, левендаальдары і сярэбраныя дукаты Галандскай Рэспублікі.

У Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім беднякі карысталіся грошамі і 1,5-грошамі, солідамі — такія манеты ў вялікай колькасці знаходзяцца ў скарбах.

— У XVII стагоддзі адбыўся фінансавы крызіс. І ў Рэчы Паспалітай манеты пачалі вырабляць, можна так сказаць, «меншага сабекошту» — медныя соліды («барацінкі»). Верагодна, разлічваючы, што народ усё роўна будзе карыстацца імі. Манеты выраблялі ў велізарнай колькасці. Як сёння сказалі б, уключалі «друкарскі станок». У выніку пачыналася інфляцыя, былі высокімі цэны. Назіралася і расстройства грашовага абароту. Так, гэта «вечнае пытанне». У прынцыпе, у эканоміцы, можна сказаць, нічога не змяняецца, — працягнуў навуковец.

«Калі на Усходзе запасы срэбра вычарпаліся, быў так званы безманетны перыяд — прыкладна ў XI-XII стагоддзях. А на Русі тады грашыма былі кавалачкі скуры, а таксама сярэбраныя зліткі — грыўні».

У адрозненне ад Еўропы, у Расіі доўгі час не было сваіх запасаў серабра. Таму замежныя манеты — з Германіі, Галандыі, Іспаніі — выкарыстоўваліся для чаканкі рускіх капеек. Іх пераплаўлялі або рабілі «дрот» для перапрацоўкі: секлі на часткі і чаканілі. Такія манеты Пётр I называў луской...

Пачынаючы з часу праўлення Пятра I, у Расіі разам з сярэбранай манетай ужо еўрапейскага тыпу ў велізарнай колькасці чаканіцца медная — палова капейкі (дзяньга), 1,2, 3 і 5 капеек. Яны таксама ў вялікай колькасці знаходзяцца ў скарбах. Апошнія скарбы — гонар віцебскага музея. Тут можна ўбачыць і карты з указаннем месцаў, дзе яны былі знойдзены. Прадстаўлены прадметы, куды хавалі грошы: манеты — у кераміку, папяровыя грошы — у бутэлькі. Ёсць скарб часоў вайны 1812 года, а побач — аўтэнтычная форма напалеонаўскага салдата.

У 1995 годзе на тэрыторыі прадпрыемства «Хімпласт» у райцэнтры Гарадок быў знойдзены скарб з сярэбранымі сталовымі прыборамі, залатымі ўпрыгажэннямі і сярэбранымі манетамі. Ён, верагодна, быў закапаны ў перыяд рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

Для зручнасці агляду на выставе ёсць інтэрактыўнае прыстасаванне. Можна націснуць, напрыклад, на карту — і на вялікім экране на сцяне з'явіцца павялічаная выява манеты, якая вас зацікавіла.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Даты Падзеі Людзі

9 СНЕЖНЯ

1805 год — 210 гадоў таму нарадзіўся (вёска Нагародавічы, цяпер Дзятлаўскі раён) Вікенцій Дмахоўскі, жывапісец. Заснавальнік беларускага пейзажнага жывапісу. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, адначасова займаўся жывапісам у Я. Рустэма. У 1831–1837 гадах быў у эміграцыі. Потым жыў у Вільні, у 1855–1858-м — у вёсцы Брацянка каля Навагрудка. Аўтар паэтычных, эмацыйна насычаных, строгіх па кампазіцыі пейзажаў: «Рака Нерыс каля Верак», «Радзіма», «Пажар у лесе», «На начлезе», гістарычнай кампазіцыі «Крыжаносцы пры аблозе крэпасці Пуня» і інш. У 1850–1854 гадах афармляў спектаклі ў Віленскім гарадскім тэатры. Памёр у 1862 годзе.

1842 год — нарадзіўся Пётр Крапоткін, рускі анархіст, географ, гісторык. Яго бацька быў генералам. Хлопчык скончыў Маскоўскую гімназію і Пажскі корпус. У 1862 годзе ў званні афіцэра Крапоткін добраахвотна ідзе ў войска і служыць у Сібіры, у Амурскім казацкім войску. Па службе Пятру Аляксеевічу даводзіцца шмат раз'язджаць па Усходняй Сібіры, ён збірае геаграфічныя і этнаграфічныя матэрыялы. Свае назіранні Крапоткін публікуе ў выглядзе нататак у газетах. У 1867 годзе Пётр Крапоткін звальняецца з ваеннай службы і пераязджае з сям'ёй у Пецярбург. Тут ён узяўся за вучобу на фізіка-матэматычным факультэце Санкт-Пецярбургскага Імператарскага ўніверсітэта і адначасова пачаў працаваць у Міністэрстве ўнутраных спраў, у аддзеле статыстыкі. Крапоткін працягнуў апрацоўваць свае геаграфічныя матэрыялы. Неўзабаве ён становіцца членам Рускага геаграфічнага таварыства. Сваім галоўным укладам у навуку Крапоткін называў стварэнне атласа горнай Азіі. У 1872-м географ едзе ў Еўропу і ўступае ў Юрскую федэрацыю Першага Інтэрнацыяналу. Адначасова з геаграфічнай дзейнасцю пачынае займацца палітыкай, вядзе рэвалюцыйную агітацыю. Бліскучыя заслугі Крапоткіна ў галіне навукі не выратавалі яго ад арышту за прыналежнасць да рэвалюцыянераў. Зрэшты, у зняволенні яму стварылі ўмовы для працы. Тут ён напісаў сваю кнігу «Даследаванні аб Ледніковым перыядзе». Праз два гады Крапоткін збег з турмы і з краіны. Да рэвалюцыі 1917 года ён пражыў у Еўропе. Пасля яе Крапоткін вярнуўся ў Расію. Ён адмовіўся ад прапановы Керанскага стаць міністрам, а таксама і ад усіх прапанаваных яму прывілеяў. Пажылы анархіст Пётр Аляксеевіч Крапоткін пасяліўся ў Дзмітраве, дзе і памёр у лютым 1921 года.

1968 год — дзень нараджэння камп'ютарнай мышы. Менавіта ў гэты дзень амерыканскі вынаходнік Дуглас Энгельбарт са Стэнфардскага даследчага інстытута на канферэнцыі па вылічальнай тэхніцы ў Сан-Францыска прадэманстраваў у рабоце першую ў свеце камп'ютарную мыш. Гэтая вынаходка ўяўляла з сябе драўляны куб на кольцах з адной кнопкай. Сваім імем мышка абавязана праводу — ён нагадваў вынаходніку хвост сапраўднай мышы. У пачатку 1970-х гадоў кампанія Xerox упершыню прадставіла мыш як частку персанальнага камп'ютара. Яна каштавала 400 долараў!

Было сказана

Георгій МАРЧУК, пісьменнік:

«Калі няма часу думаць пра шчасце — гэта і ёсць шчасце».

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ЦЯЖКІ ПАНЯДЗЕЛАК. У традыцыйнай культуры ўсходніх славян за першым днём тыдня ўстойліва замацавалася характарыстыка цяжкага, нядобрага, няўдалага і неспрыяльнага: «Панядзелак лічыцца нешчаслівым, нядобрым днём. Хто народзіцца ў гэты дзень, той будзе гультаяваты, хоць і скупы, але бедны, будзе задзірасты, ні з кім у ладу не пражыве».

◈ Панядзелак — мужчынскі дзень, што дапамагае зразумець некаторыя асаблівасці сялянскага гаспадарання. Напрыклад, не пажадана было садзіць курыцу на яйкі, таму што маглі вывесціся адны пеўнікі. І наадварот, гэты дзень лічыўся спрыяльным для пасадкі фасолі, агуркоў і гарбузоў, вечар панядзелка — для квашання капусты. Меркавалі, што ноч з панядзелка на аўторак спрыяе таму, каб у сям'і нарадзіўся хлопчык.

◈ З цягам часу з'явіліся дадатковыя перасцярогі, звязаныя з гэтым днём: не пажадана класціся ў бальніцу (доўга хварэць будзеш), а таксама звяртацца па дапамогу да знахараў, распачынаць лячэнне цяжкіх або даўніх захворванняў.

◈ На гэтым жа прынцыпе трымаецца і агульнавядомая выснова, сфармуляваная ў прыказцы: «У панядзелак нават цыган у дарогу не збіраецца, бо не пашанцуе». Калі ж гаворка ідзе пра селяніна-земляроба, які «прыкіпеў» да свайго двара і пакідае яго, толькі калі трэба трапіць на кірмаш, гэтая перасцярога набывае характар табу.

◈ Разам з тым беларускія легенды, відаць, не без уплыву біблейскіх сюжэтаў апавядаюць пра тое, што «ў панядзелак свет снаваўся». У старажытнай ведыйскай традыцыі панядзелак лічыўся днём ушанавання бога Хорсы.

◈ У рускіх прыказках, узятых, напрыклад, са слоўніка У. Даля, выкарыстоўваецца менавіта гэты алгарытм для ацэнкі панядзелка як ключавога, вызначальнага моманту, які мадэліраваў жыццё чалавека (яго справы, паводзіны, гаспадаранне) на ўвесь наступны тыдзень:

С понедельника деньги выдавать — всю неделю расход.

С понедельника на всю неделю — счастье или несчастье.

◈ Балгары таксама лічаць: калі ў панядзелак раніцай атрымаеш грошы, то ўвесь тыдзень будзеш іх атрымліваць, калі ж аддасі — увесь тыдзень вяртаць (аддаваць) будзеш.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ДЗЕ ЗІМУЮЦЬ ШКОДНІКІ?

Пачалася зіма... Здавалася б, можна расслабіцца і адпачыць у нецярплівым чаканні новага сезона. Але гэта памылка! Калі сад і агарод спакойна спяць, недзе дрэмлюць і іх шматлікія шкоднікі, разбуральныя вынікі дзейнасці якіх стануць відаць толькі з прыходам вясны.

На кары яблыні і яе галінах зімуюць залатагузкі, а пад карой — вусені яблыневай пладажэркі.

Што мы можам сёння рабіць? Дзе зімуюць садовыя і агародныя шкоднікі? І галоўнае — як іх абясшкодзіць? Звычайна актыўную барацьбу са шматлікімі шкоднікамі саду і агарода мы пачынаем у пачатку лета — калі вынікі іх дзейнасці відавочныя. І робім тым самым велізарную памылку! Пачынаць барацьбу неабходна нашмат раней. Дзякуючы таму, што надвор'е апошнія некалькі гадоў няўстойлівае (прычым незалежна ад пары года), знішчаць шкоднікаў саду і агарода вельмі зручна менавіта зімой. Ну што, прыступім?

Абследуйце дрэвы ў садзе

Паглядзіце ўважліва на дрэвы ў сваім садзе. Бачыце на некаторых з іх камячкі лісця, якое не абляцела, аблытаныя ледзь прыкметнай павуцінкай? Думаеце, гэта выпадковасць і лісточкі проста вельмі моцна трымаюцца за галінку? Або ў гэтых лісточках жыве маленькі бяскрыўдны павучок? А вось і не! Менавіта ў такім імправізаваным прытулку пасяліўся злосны вораг вашага саду — бялян жылкаваты. Абясшкодзьце яго, пакуль ён спіць, — страсіце такія лісточкі з дрэў і спаліце іх.

Уважліва агледзьце кару дрэў, асабліва калі ўвосень вы не паспелі апрацаваць яе медным купарвасам і пабяліць. Так, напрыклад, на кары яблыні і яе галінах зімуюць залатагузкі, а пад карой — вусені яблыневай пладажэркі. Каб абясшкодзіць залатагузку, зрэжце яе трывала прымацаваныя гнёзды разам з галінкай звычайным секатарам. Улічыце: валасінкі вусеня залатагузкі ядавітыя, таму, знішчаючы гнёзды шкодніка, заўсёды надзявайце пальчаткі.

Справіцца з вусенямі яблыневай пладажэркі таксама нескладана. Узімку ім, на жаль, вы ўжо нічога не зробіце — змагацца з імі можна будзе толькі з прыходам вясны: пабяліце дрэвы і замацуйце на іх спецыяльныя лоўчыя паясы, вырабленыя з кардону, шчыльнай паперы або мешкавіны.

Яблыневы кветаед, які схаваўся на зімоўку ў верхнім слоі глебы пад яблыняй, можа быць знішчаны менавіта зімой.

На кары дрэў каля пупышак і ў развілках галін можна ўбачыць кладкі яек разнастайных кляшчоў і насякомых: чырвонага яблыневага кляшча, зімняга пядзеніка і іншых. Яны могуць быць рознымі па колеры — гэта залежыць ад віду шкодніка. Каб знішчыць гэтыя кладкі, саскрабіце іх нажом або любым вострым прадметам.

На маладзенькіх парастках яблыні любяць уладкоўвацца на зімоўку яблыневая тля і медзяніцы. Выявіць іх досыць лёгка: прыглядзьцеся да кары галінак больш уважліва — на ёй даволі добра прыкметныя невялікія (каля 2,5 мм) бліскучыя чорныя яйкі яблыневай тлі і зусім маленечкія — усяго каля 1 мм у дыяметры — ярка-аранжавыя яйкі медзяніцы, якія мацуюцца да кары дрэва з дапамогай маленькіх атожылкаў. Барацьбу з гэтымі шкоднікамі трэба праводзіць у канцы зімы, калі зіма цёплая, ці вясной, але ў любым выпадку — да распускання пупышак. Для гэтага шчодра апырскайце месцы навалы яблыневай тлі і медзяніцы растворам нітрафену.

Узрыхліце глебу

Многія ворагі саду зімуюць у глебе. Напрыклад, яблыневы кветаед, які схаваўся на зімоўку ў верхнім слоі глебы проста пад яблыняй, можа быць знішчаны менавіта зімой. Для гэтага выберыце час, калі глеба вакол дрэва трохі адтае, і неглыбока ўзрыхліце яе. У выніку такіх нескладаных маніпуляцый шкоднік загіне, як толькі наступіць мароз. Калі ёсць магчымасць, узрыхліце зямлю падчас адлігі і ў маліннику — так вы знішчыце даўганосіка.

Глыбока ў зямлі ўладкаваліся на зіму і крыжакветныя блошкі. Зноў жа, знішчыць у мароз іх не атрымаецца, але, як толькі пацяплее, вы зможаце іх абясшкодзіць. Справа ў тым, што з прыходам нават першага, яшчэ няўстойлівага, цяпла крыжакветныя блошкі выбіраюцца са сваіх земляных сховішчаў вонкі. Першы час, пакуль на градках яшчэ не з'явіліся далікатныя лісточкі расады капусты, яны з задавальненнем сілкуюцца раслінамі стрэлак, якія паспяхова перазімавалі. Знішчыўшы гэтае пустазелле, вы пазбавіцеся ад крыжакветных блошак, папросту пакінуўшы іх без ежы.

Таксама ў зямлі — у прыствольных кругах — зімуюць агрэставая і парэчкавая агнёўкі, большую частку якіх можна знішчыць з дапамогай мульчы з неперапрэлага гною. Дастаткова раскласці слой мульчы таўшчынёй у 5 см, які і закрые шкоднікам вясной шлях на «свежае паветра».

З прыходам цяпла спрактыкаваныя садоўнікі рэкамендуюць правесці яшчэ адну працэдуру, якая пазбавіць ад шматлікіх садовых шкоднікаў, якія зімуюць у глебе вакол дрэў. Заключаецца яна ў наступным: вазьміце паласу звычайнага руберойду шырынёй прыкладна 30 см і накрыйце ім прыствольныя кругі. Прыбраць руберойд можна будзе пасля таго, як сад адцвіце.

Прыбярыце апалую лістоту

Калі з восені па якіх-небудзь прычынах вы не прыбралі апалае лісце ў садзе, улічыце: менавіта ў ім захоўваюцца на працягу ўсёй зімы ўзбуджальнікі такіх распаўсюджаных і небяспечных грыбных хвароб, як септарыёз і антракноз агрэсту і парэчак, парша грушы і яблыні. Акрамя таго, менавіта ў лістоце, якая апала, хаваюцца зімой жукі-даўганосікі і павуцінныя кляшчы. Менавіта таму, як толькі выдаецца такая магчымасць, прыбярыце лістоту з саду, выкарыстоўваючы яе, напрыклад, для кампосту.

Вазьміце ў саюзнікі птушак

Вопыт шматлікіх садаводаў сведчыць: якія б захады мы ні прымалі ў барацьбе з шматлікімі шкоднікамі саду і агарода, вынішчыць іх цалкам папросту немагчыма. Вось тут нам на дапамогу прыйдуць птушкі. Бо менавіта яны — найлепшыя саюзнікі ў барацьбе са шкоднікамі. Але перш, чым птушкі паклапоцяцца пра здароўе вашага саду, вам давядзецца паклапаціцца пра іх: развесіць па садзе кармушкі і як мага часцей падсыпаць у іх корм.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 11 снежня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.15	16.48	7.33
Віцебск	9.12	16.30	7.18
Магілёў	9.05	16.38	7.33
Гомель	8.53	16.43	7.50
Гродна	9.29	17.05	7.36
Брэст	9.21	17.14	7.53

Імяніны

Пр. *Васіля, Георгія, Івана, Ілы, Мікалая, Пятра, Якава.*
К. *Леакадзіі, Наталлі, Яўхіма.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +3..+5°С	КІЕЎ +1..+3°С	РЫГА +6..+8°С
ВІЛЬНЮС +4..+6°С	МАСКВА +1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +3..+5°С

УСМІХНЕМСЯ

— Чаму вы пакінулі папярэдняе месца працы?
— Офіс кампаніі пераехаў, але мне не сказалі куды...

Першыя пяць дзён бацькоўства былі казачныя: віншаванні, «абмыванні». А потым жонку выпісалі з радзільні...

— Давай сёння ляжам спаць крыху раней?
— Ужо дзве гадзіны ночы.
— Не ўдалося.

Калі жонка выходзіла за мяне замуж, яна паабяцала, што ўсё жыццё будзе любіць толькі аднаго чалавека. Але потым высветлілася, што гэты чалавек — яе мама.



Малюнак Уладзіміра ЧУГПАЗАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4951.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 8 снежня 2015 года.